МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

# ЗАГАД

# ПРИКАЗ

18.01.2022 № 32

г. Мінск

г. Минск

Аб правядзенні XXXII міжнароднага фестывалю народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік»

На падставе пункта 17 пераліку асобных міжнародных і рэспубліканскіх цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў, якія праводзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 2 красавіка 2015 г. № 263, пунктаў 5 і 7 Інструкцыі аб парадку правядзення міжнароднага фестывалю народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік», зацверджанай пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2007 г. № 14,

ЗАГАДВАЮ:

1. Правесці з 10 па 12 чэрвеня 2022 г. у г.Паставы Віцебскай вобласці XXXII міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» (далей – фестываль).

2. Зацвердзіць склад арганізацыйнага камітэта фестывалю (дадаецца).

3. Упраўленню культуры Віцебскага аблвыканкама сумесна з дзяржаўнай установай «Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці» і аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пастаўскага райвыканкама арганізаваць работу па падрыхтоўцы і правядзенні фестывалю.

4. Структурным падраздзяленням, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама забяспечыць фарміраванне творчых дэлегацый і іх удзел у фестывалі.

5. Кантроль за выкананнем загаду ўскласці на намесніка Міністра Грамаду В.І.

Міністр А.М.Маркевіч

Зак. 516.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
18.02.2022 № 38

СКЛАД
арганізацыйнага камітэта XXXII міжнароднага фестывалю народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік»

| | | |
|---|---|---|
| Грамада Валерый Іванавіч | – | намеснік Міністра культуры Рэспублікі Беларусь, сустаршыня |
| Пенін Уладзімір Пятровіч* | – | намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама, сустаршыня |
| Чэпік Сяргей Васільевіч* | – | старшыня Пастаўскага райвыканкама, сустаршыня |
| Баркевіч Галіна Фёдараўна | – | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама |
| Галабурда Іван Іванавіч | – | кансультант упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры |
| Карповіч Ірына Уладзіміраўна | – | начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры |
| Лабука Кацярына Пятроўна | – | дырэктар дзяржаўнай установы «Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці» |
| Чаплінская Галіна Мікалаеўна | – | начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пастаўскага райвыканкама, дырэктар фестывалю |
| Чымбург Станіслаў Уладзіміравіч* | – | намеснік старшыні Пастаўскага райвыканкама |

* З яго (яе) згоды, яго (яе) кіраўніка.